УДК 069.158:[391+398](476.2)

# КАЛІНКАВІЦКІ СТРОЙ У МАТЭРЫЯЛАХ ЭКСПЕДЫЦЫІ ВАЦЛАВА ЛАСТОЎСКАГА 1928 Г.

***В. А. Лабачэўская,***
*доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** З нагоды 140-годдзя з дня нараджэння Вацлава Ластоўскага ў артыкуле прыведзены агляд фотадакументацыі калінкавіцкага строя, якая была зроблена падчас этнаграфічнай экспедыцыі 1928 г. Беларускага дзяржаўнага музея, праведзенай пад кіраўніцтвам В. Ластоўскага. Адзначана ўнікальнасць матэрыялаў, якія зафіксавалі натуральнае існаванне лакальнага варыянта народнага касцюма напярэдадні калектывізацыі беларускай вёскі на тэрыторыі сучасных Калінкавіцкага і Светлагорскага раёнаў Гомельскай вобласці.

**Ключавыя словы:** народнае адзенне, калінкавіцкі строй, этнаграфія, экспедыцыя.

# KALINKOVICHI'S OUTFIT IN THE MATERIALS OF THE 1928 EXPEDITION OF VACLAV LASTOVSKY

***V. Lobachevskaya,***
*Doctor of Art History, Associate Professor, Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** On the occasion of the 140$^{th}$ anniversary of the birth of Vaclav Lastovski, the article provides an overview of the photographic documentation of the Kalinkovichi's outfit, which was made during the ethnographic expedition of the Belarusian State Museum in 1928, conducted under the leadership of V. Lastovski. The author notes the uniqueness of the materials that recorded the natural existence of the local version of the folk costume on the eve of the collectivization of the Belarusian village on the territory of modern Kalinkovichi and Svetlogorsk districts of the Gomel region.

**Keywords:** folk clothes, Kalinkovichi's outfit, ethnography, expedition.

З нагоды 140-годдзя з дня нараджэння Вацлава Ластоўскага варта звярнуцца да яго этнаграфічнай і мастацтвазнаўчай працы, якая не дастаткова поўна асвечана ў навуковай літаратуры. Перыяд дзейнасці па вяртанні ў Мінск у 1927 г. і да арышту ў 1929 г. па справе «Саюза вызвалення Беларусі» можна вылучыць у біяграфіі В. Ластоўскага як «этнаграфічны». Ён узначальвае кафедру этнаграфіі Інбелкульту і як дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея актыўна займаецца зборам этнаграфічнай калекцыі і яе апісаннем. В. Ластоўскі не абмінаў магчымасці непасрэдна назіраць праявы жыцця і побыту беларусаў, дакрануцца да крыніц народнай мудрасці і прыгажосці. На працягу 1928 г. ён узяў удзел у дзвюх этнаграфічных экспедыцыях, мэтай якіх было вывучэнне народнага мастацтва і матэрыяльнай культуры. Першая экспедыцыя выязджала па маршруту Слуцк – Асташкавічы (каля Мазыра), другая – Лепель – Полацк.

Матэрыялы, сабраныя на Случчыне і Мазыршчыне, захаваліся ў выглядзе фотаальбома, які належыць Бібліятэцы-музею імя Ф. Скарыны ў Лондане і ў выглядзе копіі даступны ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Колоса ў Мінску [1]. Адной з мэт гэтай экспедыцыі было вывучэнне народнага касцюма і, у прыватнасці, тэрыторыі распаўсюджання паяснога адзення – панёвы. Маршрут быў складзены такім чынам, што ахопліваў тэрыторыю, дзе бытаваў вельмі багаты па складзе і характару аздаблення жаночы строй адзення – вёскі сучасных Акцябрскага, Калінкавіцкага і Светлагорскага раёнаў Гомельскай вобласці. Экспедыцыя сярод іншага наведала Ляскавічы, Бубнаўку, Забалацце, Ламавічы, Ляскі, Граб’е (Акцябрскі раён); Азарычы, Лісец, Сышчыцы, Даманавічы, Анісавічы, Лампекі, Давыдавічы, Казловічы, Халаднікі (Калінкавіцкі раён); Асташкавічы (Светлагорскі раён). У гэтых мясцінах да 1928 г. не пралягалі шляхі аніводнага беларускага этнографа. Экспедыцыя В. Ластоўскага была першай этнаграфічнай выправай у гэтыя цікавыя на адметнасці традыцыйнай культуры раёны Беларусі. Для даследчыкаў беларускага народнага касцюма фотаздымкі 1928 г. з’яўляюцца адзінымі візуальнымі дакументамі таго часу з пералічаных раёнаў. У альбоме змешчаны 110 фотаздымкаў жанчын, мужчын, дзяцей у традыцыйным адзенні, фотаздымкі экспанатаў, якія былі прывезены ў музей: сарочкі, фартухі, гарсэты, галаўныя ўборы і ўпрыгожанні (былі згублены падчас Другой сусветнай вайны). У 1930-я гг. у БССР калектывізацыя карэнным чынам змяніла сялянскі лад жыцця. Моцна пацярпелі гэтыя раёны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Экспедыцыйныя даследаванні тут узнавіліся толькі ў пачатку 1970-х гг.

У вёсках Ламавічы, Граб’е, Сышчыцы, Анісавічы, Даманавічы, Асташкавічы ў той час жанчыны яшчэ апраналі на свята, у царкву поўныя традыцыйныя строі адзення. У іх гарманічна спалучаліся сарочкі з багата аздобленымі арнаментам рукавамі, фартухі, безрукаўкі, андаракі, дзявочыя галаўныя павязкі, жаночы наміткі і хусткі. Шмат выразных

фота жанчын у мясцовых маляўнічых строях былі зроблены ў в. Даманавічы. Кідаецца ў вочы прыгажосць жанчын, адбітак якой ляжыць на іх спакойных тварах і годных постацях. На большасці фотаздымкаў заўважана, што людзі ахвотна і нязмушана пазіруюць, прыязна, з усмешкай паглядаючы на гарадскіх гасцей. Тэадор Гальмаджан, які ў якасці супрацоўніка музея браў удзел у экспедыцыі, у адпаведнасці з патрабаваннямі да этнаграфічных фота здымаў людзей у фас, профіль, ззаду ў рост, рабіў партрэты найбольш прыгожых мадэлей. Фатографу ўдалася зрабіць некалькі па-мастацку выразных жаночых партрэтаў. Прыцягвае ўвагу фота маладзіцы з в. Лампекі ў святочнай вопратцы з вышываннем у руках, якой, здаецца, не больш за 16 год. Прываблівае вока дзяўчына ў прыгожым строі з багата аздобленым аплікацыяй гарсэце на групавым фота жанчын в. Анісавічы каля ткацкага станка, якое зроблена на вуліцы.

Сучаснага чалавека не могуць не ўразіць экспедыцыйныя калектыўныя фотаздымкі з вёсак, якія тады адносіліся да Мазырскай акругі. На іх адлюстравана шматпакаленнасць вясковай грамады. У в. Даманавічы каля Міхайлаўскай царквы пасля службы члены экспедыцыі размаўлялі з прыхаджанамі, сярод якіх былі і вяскоўцы з в. Анісавічы, Лампекі, Давыдавічы, і фатаграфавалі іх у святочных уборах. Нядзельная раніца выдалася тады не вельмі цёплай, і старыя жанчыны з суседніх вёсак былі апранутыя ў світкі; іншыя, дэманструючы прыгожае святочнае ўбранне, трымалі ў руках хусткі-ахінанкі. На іншым здымку каля царкоўнай агароджы фатографу пазіруюць некалькі жанчын, сярод якіх вылучаецца высокая статная бабуля ў намітцы і хустцы пад бараду, завязанай на патыліцы. Іншыя сталыя жанчыны маюць на галовах хусткі, завязаныя па-мясцоваму ззаду, што адкрывае іх прыгожыя твары. На другім фота з в. Аніскавічы на фоне хаты выразна пазіруюць тры маладзіцы ў багата аздобных строях і хлопец у вышыванай кашулі, палатняных партах з шырокім чырвоным поясам.

Фота перадаюць прыгожы святочны бок вясковага жыцця і людзей, якія ўмелі стварыць вакол сябе свет прыгожосці. Экспедыцыя яшчэ заспела перадкалгасную вёску. Літаральна праз год, у 1929 г. у БССР пачалася прымусовая калектывізацыя, і гэты свет быў беззваротна страчаны. У 1939 г. у в. Даманавічы была разбурана Міхайлаўская царква, каля якой былі зроблены шматлікія экспедыцыйныя фота.

Фотаздымкі з в. Даманавічы выразна паказваюць, што агульнасць традыцый народнага адзення, яго пэўны мясцовы мастацкі канон ахоплівалі тэрыторыю царкоўнага прыходу. Для жанчын прыходская царква ў святочныя і нядзельныя дні станавілася месцам дэфіле ўзораў мясцовага адзення, дэманстрацый арнаментаў вышыўкі, запазычання элементаў гарадской моды. У навакольных вёсках на той час існаваў адзіны ў сваіх агульных рысах строй жаночага касцюма, аб чым пераканаўча сведчаць фотаздымкі экспедыцыйнага альбома.

У 1980-я гг. беларускі мастацтвазнавец Міхась Раманюк, які праводзіў даследаванне народнага касцюма, таксама наведаў в. Давыдавічы і Асташкавічы, дзе ў 1928 г. пабывалі ўдзельнікі экспедыцыі В. Ластоўскага. Ён вызначыў на тэрыторыі Калінкавіцкага і Светлагорскага раёнаў існаванне адметнага комплексу адзення, якому даў назву «калінкавіцкі строй». Даследчык пісаў: «Калінкавіцкі строй – адна з вяршынь мастацтва беларускага народнага касцюма. Ён урачыста-маляўнічы і ў той жа час стрыманы, зачароўвае мяккай паэтычнасцю і вытанчанасцю густу» [3, іл. 128–131, 135–185].

Адметнасцю жаночага варыянта калінкавіцкага строя з'яўляюцца сарочкі паліковага крою з пышнымі рукавамі з багатым геаметрычным арнаментам, зборчатыя каўняры-брыжжы, кабаты з гарлавінай пад шыю з баскай на таліі, аздобленыя арнаментам, выкладзеным з тасмы-в'юнчыку, нашытымі металічнымі гузікамі і бляшкамі. У склад жаночага касцюма ўваходзіў галаўны ўбор ручніковага тыпу – наметка, дзявочага ўбрання – кіндачка, завязка. Існаваў звычай падвязваць паверх наметкі цямнейшую хустку з махрамі, якая падхоплівала падбародак і завязвалася на патыліцы, што з этнаграфічнай дакладнасцю зафіксавана на адным са здымкаў экспедыцыі. Фота каштоўныя тым, што адлюстроўваюць спосабы апранання частак строя, манеру нашэння касцюма і годнасць жанчын, якія адчуваюць сябе прыгожымі. Выдатныя здымкі маладзіцы ў намітцы і з падаткнутым падолам андараку, з-пад якога бачны аздобленыя тканым арнаментам прыпол сарочкі. Яны зроблены ў тры чвэрці і фас каб паказаць спосаб нашэння паяснога адзення і прадэманстраваць пластыку гарманічнага і дапасаванага ва ўсіх частках касцюма.

В. Ластоўскі ў подпісах да фотаздымкаў зафіксаваў мясцовую назву зборчатага каўняра – «крыза́». У альбоме ёсць фота зусім маленькай босай дзяўчынкі ў доўгай кашульцы з аздобнымі палікамі і крызой з в. Граб'е. Другое фота дзяўчынкі з в. Асташкавічы таксама дэманструе крызу, а подпіс падае яе назву. Гэтыя рэдкія візуальныя дакументы сведчаць, што дзіцячы строй у беларусаў адпавядаў выгляду касцюма дзяўчын і жанчын. Назва «крыза» паходзіць ад французскай назвы каўняра «фрэза» і адлюстроўвае сувязі мастацкай культуры беларускай вёскі з еўрапейскай культурнай прасторай [2].

Удачай экспедыцыі стала фіксацыя мужчынскага старадаўняга святочнага касцюма, які складаўся з арнаментаванай кашулі, палатняных партоў, узорчатага пояса, магеркі, ботаў з адкасанымі халявамі. Бясцэннымі з'яўляюцца фота старых у такім строі з в. Асташкавічы. На адным з іх – дзед Мікіта, а на другім, непадпісаным, бачым старога з сівой барадой і валасамі, стрыжанымі «пад гаршчок», у прасторнай кашулі да кален, якая багата аздоблена шчыльным чырвоным натыканнем і арнаментаванымі расшыўкамі па прыполу, вышыўкай пазухі і стыкаў станіны і рукавоў. На фота набытых для музея мужчынскіх ка-

шуль бачны тунікападобны крой, які лічыцца найбольш старажытным у беларускім адзенні. Такія кашулі старыя захоўвалі на смерць.

Вынікі экспедыцыі В. Ластоўскі апісаў у артыкуле «Экспедыцыя для вывучэння беларускай народнай вопраткі і народнага мастацтва», якія надрукаваў у II томе «Прац катэдры этнаграфіі», наклад якога быў канфіскаваны пасля арышту В. Ластоўскага. Артыкул, напэўна, змяшчаў шмат цікавых і каштоўных назіранняў, канкрэтных звестак аб характары бытавання народнага касцюма, спосабах яго аздаблення, мясцовых назвах асобных частак і дэталей.

1. *Лабачэўская, В. А.* Архіў забытай экспедыцыі Вацлава Ластоўскага 1928 года па маршруце Слуцк – Асташкавічы / В. А. Лабачэўская // Культура и быт белорусов в этнографических исследованиях и музейных коллекциях : материалы междунар. науч. конф. (7–8 июня 2012 г., г. Минск) / [сост.: Н. С. Бункевич и др.]. – Минск, 2012. – С. 83–86.

2. *Лабачэўская, В. А.* Каўняры-брыжы ў жаночых сарочках калінкавіцкага строю: да праблемы паходжання / В. А. Лабачэўская // Материалы Междунар. научно-практ. конф. «Национальный костюм как элемент исторического наследия в современной культуре», г. Могилев, 24–28 апр. 2018 г. – Могилев, 2018. – С. 58–67.

3. *Раманюк, М.* Беларускае народнае адзенне / М. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – [47] с., [128] л. іл.